УДК 331.5(476)

А. С. Казлоў, аспірант

# АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ ПАВЫШЭННЯ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ РЭГІЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ ЗАНЯТАСЦІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

The State regional active policy on the labor market is analyzed and the proposals for increasing its effectiveness are represented. Two models of Restructuring former sector and its results for labor market are studied.

Беспрацоўе выклікае страту чалавечага капіталу ў сувязі са зніжэннем кваліфікацыі і прафесійных уменняў беспрацоўных. І гэта вядзе ў выніку да зніжэння прадукцыйнасці рабочай сілы. Адным з важных заданняў актыўнай палітыкі на рынку працы з'яўляецца супрацьдзеянне гэтай тэндэнцыі. Яна скіраваная на падтрыманне эфектыўнай прапановы на рынку працы, паляпшэнне дастасавання прапановы да попыту на рабочую сілу.

Акрамя паказчыка ўзроўню беспрацоўя, на рэгіянальным рынку працы ў Беларусі кантроль вядзецца таксама па такіх паказчыках, як удзельная вага зарэгістраваных беспрацоўных у агульнай колькасці звольненых, удзельная вага асоб, што звярнуліся ў службу занятасці, у агульнай колькасці неактыўнай рабочай сілы, і інш. Гэтыя паказчыкі вельмі важныя, паколькі ў Беларусі значная колькасць беспрацоўных не рэгіструецца ў цэнтрах занятасці, аднак уплывае на агульны стан рынку працы. Важным таксама з'яўляецца кантроль над рэгіянальнымі і крытычнымі рынкамі працы. Аналіз і прагноз занятасці на падставе метаду балансу працоўных рэсурсаў можна прызнаць у беларускай рэчаіснасці найбольш адпаведнымі.

Палітыка на рынку працы падзяляецца ў эканамічнай тэорыі на макраэканамічную, палітыку дэрэгуляцыі рынку працы і актыўную палітыку дзяржавы [1, с. 229–231]. Таму неабходна рабіць аналіз макраэканамічнай палітыкі дзяржавы на рынку працы (якая таксама, як і актыўная палітыка, аказвае на яго значнае ўздзеянне), а таксама яе вынікаў і эфектыўнасці. У Беларусі некалькі год прымяняецца Кейнсіянская мадэль павышэння ўнутранага попыту дзякуючы мэтаваму інвеставанню ў выбраныя галіны, такія, як жыллёвае будаўніцтва, сельская гаспадарка і інш. У сувязі з гэтым мэтазгодна кантраляваць наступныя паказчыкі: аб'ём экспарту, змены ўнутранага попыту (аб'ём нерэалізаванай прадукцыі, даходы нізкааплачваемых працаўнікоў, паколькі яны тэарэтычна ствараюць найбольшы эфектыўны спажывецкі попыт згодна з тэорыяй Дж. Кейнса [1]), інвестыцыйную актыўнасць і інш.

Прагноз узроўню беспрацоўя павінен абапірацца на макраэканамічны аналіз развіцця краіны і магчымых рыначных шокаў (напрыклад, такіх, як павышэнне цаны на газ, уступленне галоўнага гандлёвага партнёра Рэспублікі Беларусь – Расіі ў Сусветную гандлёвую арганізацыю, павышэнне міжнароднай канкурэнцыі і зніжэнне пратэкцыянізму для прамысловай вытворчасці Беларусі і інш.).

Актыўная палітыка дзяржавы на рынку працы ўключае прафесійнае навучанне, павышэнне кваліфікацыі і перакваліфікацыю, а таксама грамадскія працы, геаграфічныя перамяшчэнні рабочай сілы да вольных месцаў працы, субсідыі занятасці беспрацоўных на прадпрыемствах, субсідыі, крэдыты і дапамога для самазанятасці і пачынання прыватнага малога бізнесу. Пасіўная палітыка галоўным чынам імкнецца падтрымаць узровень жыцця беспрацоўнага ў перыяд пошуку працы і тым самым стварае асноўныя для гэтага ўмовы. Яна ўключае выплату грашовай дапамогі беспрацоўным. Актыўная палітыка адыгрывае важную ролю для функцыянавання рынку працы, паколькі супрацьдзейнічае працэсу зніжэння прадукцыйнасці рабочай сілы ў час беспрацоўя, падтрымлівае эфектыўную прапанову на рынку працы, паляпшае дастасаванне прапановы да попыту на рабочую сілу і інш. Неабходна ўлічваць, што актыўная палітыка дзяржавы на рынку працы можа выклікаць негатыўныя эфекты.

– Эфект «халастога ходу», пры якім удзел ў актыўнай праграме не прыносіць карысці для занятасці, а паступленне на працу магло б адбыцца і без удзелу ў навучальнай праграме.

– Эфект замены, калі ўдзельнікі актыўных праграм замяшчаюць на працы тых, хто не ўдзельнічае. Гэты эфект назіраецца, калі кошт удзельніка праграмы для прадпрыемства меншы за неўдзельніка.

– Эфект выпіхвання, пры якім экспансія актыўных праграм службаў занятасці выпіхвае з рынку прыватныя прадпрыемствы, якія займаюцца падобнай дзейнасцю і навучаннем [1, с. 315].

За аснову актыўнай палітыкі на рынку працы ў Беларусі была прынятая мадэль, запазычаная з рыначнай эканомікі, якая ўвесь час мяняецца, каб лепш адпавядаць мясцовай рэчаіснасці. Беларуская рэчаіснасць патрабуе ўлічваць у палітыцы занятасці асаблівасць працэсу трансфармацыі, які значна адрозніваецца ад таго, што адбываўся ў іншых краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, і яго ўплыў на рынак працы.

Параўноўваючы краіны трансфармацыі, можна выдзеліць дзве мадэлі дастасаванняў на рынку працы. Першая характэрная для краін, якія правялі хуткія рыначныя рэформы, так званую «шокавую тэрапію» (Польшча, Венгрыя і інш.). Тут адзначаецца рэзкі і глыбокі спад ВУП (валавы ўнутраны прадукт), а таксама значны рост яўнага беспрацоўя. У пазнейшым перыядзе назіраецца актывізацыя і эканамічны рост з частковым скарачэннем беспрацоўя. Зніжэнне ўзроўню беспрацоўя адбылося дзякуючы павышэнню занятасці, а таксама ў выніку памяншэння долі зарэгістраваных беспрацоўных пасля сканчэння перыяду грашовай дапамогі або пераходу іх ў ценявую эканоміку, ранейшага выхаду на пенсію, дэзактывізацыі. Цяжар рэформаў у гэтай мадэлі лёг на занятасць са значным яе скарачэннем. Высокі ўзровень беспрацоўя пры гэтым аказаўся досыць устойлівым і цяжка ліквідуемым па прычыне гістэрэзісу беспрацоўя. Многія аўтары [2] пазней адзначылі, што высокі ўзровень беспрацоўя не з'яўляўся неабходнай умовай для правядзення рэформаў.

Другая мадэль, выкарыстоўваемая ў СНД, у тым ліку і Беларусі, характарызуецца павольнай і асцярожнай палітыкай рэформаў у спалучэнні з пратэкцыянісцкай палітыкай у сектары вытворчасці. Для гэтай мадэлі характэрныя нізкі ўзровень афіцыйнага беспрацоўя і высокі ўзровень схаванага, а таксама павольнае і, часам, больш глыбокае зніжэнне ВУП. У працэсе трансфармацыі адзначылася значная эластычнасць зарплат і трывалая сувязь з прадпрыемствам. Работнікі працягвалі працаваць на прадпрыемстве, атрымліваючы нізкую заработную плату або ўвогуле яе не атрымліваючы, карыстаючыся, часам, іншымі формамі сацыяльных дабротаў прадпрыемства. Такім чынам, адсутнасць раўнавагі на рынку працы выявілася ў назапашванні схаванага беспрацоўя пры значным паніжэнні рэальных зарплат (і прадукцыйнасці працы). Наяўнасць схаванага беспрацоўя можа адбіцца на эфектыўнасці працы прадпрыемстваў, асабліва пры ўмове паслаблення пратэкцыянізму і нарастання міжнароднай канкурэнцыі. З іншага боку, у кароткім перыядзе яна дае магчымасць стрымаць страчванне чалавечага капіталу працаўнікоў, што адбываецца больш інтэнсіўна пры адкрытым беспрацоўі. Такім чынам, паколькі асноўны патэнцыял беспрацоўных на рэгіянальных рынках працы Беларусі знаходзіцца ў стане схаванага беспрацоўя на прадпрыемствах, патрэбна стымуляваць працадаўцаў наймаць працаўнікоў непасрэдна з прадпрыемстваў, якія маюць залішнюю працоўную сілу. Трэба імкнуцца забяспечыць пераход працаўнікоў з неэфектыўнай занятасці на прадпрыемствах з лішкам працоўнай сілы ў больш эфектыўную форму занятасці. Неабходна актывізаваць абсорбцыю схаваных беспрацоўных больш эфектыўным сектарам прыватнага малога і сярэдняга бізнесу, мінаючы стадыю яўнага беспрацоўя. Такую форму змены працы ў краінах ЦУЕ (Цэнтральнай і Усходняй Еўропы) адзначае Н. Бар [2]. Ён лічыць, што «працадаўцы імкнуцца шукаць працаўнікоў не сярод беспрацоўных ў цэнтрах занятасці, а аддаюць перавагу найму непасрэдна з дзяржаўнага сектара». Галоўнай умовай для гэтага з'яўляецца бурнае развіццё прыватнага малога і сярэдняга бізнесу, які, як паказвае вопыт краін трансфармацыі, у стане забяспечыць эфектыўныя працоўныя месцы працы. У краінах з развітой рыначнай эканомікай паняцце беспрацоўя бінарнае, г. зн. заняты, або беспрацоўны, а таксама заняты, або знаходзіцца на пенсійным адпачынку [2]. У беларускай рэчаіснасці гэта паняцце носіць «размыты» характар па прычыне вялікай удзельнай вагі схаванага беспрацоўя, неэфектыўнай занятасці, нерэгістраванага беспрацоўя. Таму неабходна больш эфектыўна акрэсліць мэтавыя групы для ўздзеяння палітыкі занятасці. Першай мэтавай групай рэгіянальнай палітыкі занятасці, на нашу думку, павінна быць рабочая сіла прадпрыемстваў, якія маюць неэфектыўную занятасць. Колькасць схаваных беспрацоўных на канкрэтным прадпрыемстве можна ацаніць з дапамогай экспертнага апытання, а таксама па методыцы, распрацаванай А. Ванкевіч. Другая мэтавая група, якая часта папаўняе шэрагі беспрацоўных, павінна ахопліваць студэнтаў ВНУ, ПТВ і школьнікаў. Трэцяя – гэта доўгатэрміновыя беспрацоўныя. Для дадзеных трох груп можна стварыць праграму павышэння актывізацыі і інтэнсіфікацыі пошукаў на рынку працы. Такі метад тэарэтычна абгрунтаваны неакласічнай школай, а менавіта «тэорыяй беспрацоўя раўнавагі, якое не павышае інфляцыі (NAIRU)». Інтэнсіўнасць пошукаў на рынку працы стварае ўяўленне аб значнай канкурэнцыі, што стымулюе павышэнне прадукцыйнасці і эфектыўнасці працы ўжо працуючых, а таксама запавольвае тэндэнцыю павышэння заработных плат (што павышае попыт на працу) [1]. Метады павышэння інтэнсіўнасці пошукаў на рынку працы распрацаваныя ў заходняй літаратуры і ўключаюць элементы прафарыентацыі, псіхалагічнай дапамогі, павышэнне інфармаванасці аб дзейнасці рынку працы, метадах пошукаў вольных вакансій і інш. Такое навучанне можна арганізаваць у цэнтрах занятасці для доўгатэрміновых беспрацоўных, у навучальных установах і на дзяржаўных прадпрыемствах.

Рэгіянальная служба занятасці ў Беларусі не бярэ ў прагнозе пад увагу выпускнікоў ВНУ, тэхнікумаў, ПТВ і інш [4]. Сапраўды, як адзначаецца, яны павінны быць размеркаваныя навучальнай установай. Аднак, як паказвае практы-

ка, такое размеркаванне часта скончваецца фармальнасцю. Таму сярод маладых спецыялістаў шмат беспрацоўных, часта незарэгістраваных, паколькі яны не маюць права на рэгістрацыю па прычыне іх афіцыйнага размеркавання. Абавязковае размеркаванне абцяжарвае прадпрыемствы, якія і без таго маюць залішнюю занятасць. Яно таксама не спрыяе канкурэнцыі за працоўныя месцы сярод выпускнікоў і матывацыі да атрымання лепшых уменняў і працоўных якасцяў падчас навучання. Асобнай групай да ўздзеяння актыўнай палітыкі занятасці можа быць частка насельніцтва, што статыстычна ўлічваецца як «занятыя ў домагаспадарцы».

Гэтыя людзі фактычна беспрацоўныя, аднак не зарэгістраваныя ў службе занятасці. Яны ў меншай ступені страчваюць свой працоўны патэнцыял, паколькі выбралі стратэгію падтрымання ўзроўню жыцця, працуючы ў падсобнай гаспадарцы. Для пэўнай часткі гэтай групы эфектыўнай была б выдача крэдытаў для пачатку прадпрымальніцкай дзейнасці.

Стварэнне новых рабочых месцаў – вельмі важны і неабходны элемент палітыкі занятасці, аднак ён апраўдвае сябе толькі пры ўмове стварэння **эфектыўных** рабочых месцаў. Гэта значыць такіх, якія б прыносілі карысць прадпрыемству ў выглядзе павышэння прыбытку і карысталіся попытам сярод працаўнікоў. Аналіз фактаў паказвае, што большасць новастваранных пры дапамозе грашовых сродкаў службы занятасці новых рабочых месцаў на дзяржаўных заводах у г. Брэсце у 2003 г. засталіся не занятыя па прычыне нізкай заработнай платы. Ва ўмовах абмежаваных фіскальных сродкаў гэта неапраўданыя выдаткі. Сумнеўнай здаецца неабходнасць абавязковых грамадскіх прац пры рэгістрацыі беспрацоўнага і як умова атрымання грашовай дапамогі. На нашу думку, гэта папершае, «адпужвае» значную частку беспрацоўных ад рэгістрацыі ў цэнтры занятасці, што не дазваляе кантраляваць рэальную напружанасць на лакальных рынках працы. Па-другое, грамадскія працы могуць адрываць беспрацоўнага ад працэсу інтэнсіўных пошукаў занятасці. Неабходна, аднак, адзначыць карысць грамадскіх прац пры ўмове дабравольнага ўдзелу ў іх. Як паказала апытанне беспрацоўных ў Дзяржынскім раёне, аплачваемыя грамадскія працы адыгрываюць пэўную ролю ў падтрыманні жыццёвага ўзроўню нізкакваліфікаваных беспрацоўных. Многія з беспрацоўных выкарыстоўваюць грамадскія працы ў калгасах падчас уборкі ўраджаю для забеспячэння сям'і гароднінай і садавінай, а таксама маюць магчымасць мінімальнага заробку. Грамадскія працы стымулююць беспрацоўных да дысцыплінаванай працы ў калектыве, што ў пэўнай ступені супрацьдзейнічае працэсу страчвання працоўных якасцяў у перыяд беспрацоўя.

Такім чынам, прагноз на рынку працы павінен пачынацца з макраэканамічнага аналізу і прагнозу значных эканамічных шокаў, якія могуць паўплываць на сітуацыю на рынку працы. Ва ўмовах «размытасці» азначэння «беспрацоўны» ў Беларусі палітыка занятасці павінна ўключаць таксама як мэтавую групу «схаваных» беспрацоўных на дзяржаўных прадпрыемствах, якія маюць лішкі працоўнай сілы (асабліва ў рэгіёнах з монапсанічнай структурай рынку працы). Неабходна стымуляваць непасрэдны пераплыў рабочай сілы з неэфектыўнай занятасці на дзяржаўных прадпрыемствах з лішкам працоўнай сілы на эфектыўныя месцы працы ў сектары прыватнага малога і сярэдняга бізнесу у самазанятасць і эфектыўныя новастворaныя месцы працы. Павышэнне інтэнсіўнасці пошукаў на рынку працы павінна ахопліваць доўгатэрміновых беспрацоўных, а таксама студэнтаў апошніх курсаў ВНУ, ПТВ і інш., працаўнікоў дзяржаўных прадпрыемстваў з неэфектыўнай занятасцю і занятых ў домагаспадарцы.

**Літаратура**


1. Kwiatkowski E. Bezrobocie. Podstawy teoretyczne. – Warszawa: PWN, 2002. – 352 s.
2. Nicholas Barr Reforma państwa opiekuńczego w krajach postkomunistycznych / w Po dyiesięciu latach – transformacja i rozwoj w krajach postkomunistycznych, pod red. Nenemana, Warszawa: CASE, 2000. – С. 183–230.
3. Струк Т. Г. Пути повышения эффективности активной политики занятости на региональном рынке труда. // Белорусская экономика: анализ, прогноз, регулирование, 2000. – № 6. – С. 8–12.